Источник: “Літаратура і мастацтва” – 2014-03-07



# Пра галоўнае з любоўю

**Вечарына «…Галоўнае ў жыцці — жыццё», што днямі адбылася ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі,** арганізаваная пры ўдзеле Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, была прысвечана 85-годдзю з дня нараджэння вядомай беларускай паэтэсы Еўдакіі Лось.



*Фота Наталі Купрэвіч*

*Слова трымае сын паэтэсы Дзмітрый Лось.*

Наталля Мізон, вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, ва ўступным слове нагадала асобныя факты біяграфіі творцы, якая нарадзілася ў вёсцы Старына на Ушаччыне (Віцебская вобласць) у першы дзень вясны. Дэбютны паэтычны зборнік пад назвай «Сакавік» пабачыў свет у 1958 г. Паводле Ніны Камаровай, загадчыка аддзела абслугоўвання чытачоў ЦНБ НАН Беларусі, на працягу ўсяго жыцця Еўдакія Якаўлеўна задавалася пытаннямі пра тое, як трэба пісаць і якой павінна быць паэзія. «Усё ў жыцці — да лепшага сродак», — аднойчы занатавала яна ў сваім дзённіку.

Даследчыца творчай спадчыны паэтэсы Ірына Шматкова назвала сваю прамову «біяграфіяй у вершах». Першыя паэтычныя творы юнай Еўдакіі пабачылі свет яшчэ перад трагічнымі падзеямі Вялікай Айчыннай. З цягам часу яе лірыка набыла выхаваўчы пафас. Вершы яскравай прадстаўніцы «філалагічнага пакалення» (у 1948 г. скончыла Глыбоцкае педвучылішча, у 1955-м — філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута), родапачынальніцы самабытнай плыні жаночай паэзіі ў беларускай літаратуры — гэта адлюстраванне *яе* эпохі. Цэлы шэраг твораў Е. Лось прысвяціла самым блізкім людзям — маці і сыну. «Бараўлянскі сшытак» стаўся вершаваным увасабленнем заключнага адрэзка жыццёвага і творчага шляху паэтэсы.

Пісьменнік, галоўны рэдактар дзіцячых часопісаў «Вясёлка» і «Буся» Уладзімір Ліпскі падкрэсліў: у беларускай літаратуры, паэзіі не так многа жанчын, і Еўдакіі Лось належыць асобнае пачэснае месца. Уладзімір Сцяпанавіч прадэманстраваў прысутным адзін з нумароў часопіса «Вясёлка», падпісаны ў друк самой паэтэсай, якая кіравала выданнем у 1975 — 1977 гг.

Дзмітрый Лось, сын Еўдакіі Якаўлеўны, распавёў: яго дзяцінства праходзіла пераважна ў разлуцы з маці, але хлопчык з маленства вывучаў родную мову, у тым ліку з дапамогай маміных кніг. Дарэчы, творы для маленькіх складаюць асобную старонку жыцця паэтэсы. Падчас вечарыны таксама прагучала некалькі песень у выкананні юных удзельнікаў узорнага ансамбля народнай музыкі «Бараўлянская крынічка».

На выстаўцы творчай спадчыны Е. Лось «Зараз выкажу, выпею сонца-душу», падрыхтаванай ЦНБ НАН Беларусі, былі прадстаўлены прыжыццёвыя паэтычныя зборнікі — ад «Сакавіка» да «Лірыкі ліпеня» (1977), новыя перавыданні і публікацыі твораў, аўтарскія пераклады з розных моў свету, а таксама літаратуразнаўчыя працы, прысвечаныя яе жыццю і творчасці.

**Яна ЯВІЧ**

Саюз пісьменнікаў Беларусі глыбока смуткуе з прычыны смерці заслужанага архітэктара Беларусі, двойчы лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Ленінскай прэміі і прэміі Ленінскага камсамола Леаніда Мендзелевіча ЛЕВІНА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Яна Явіч. Пра галоўнае з любоўю